***Дудзінская Л. У.**, настаўнік пачатковых класаў Дружылавіцкага ВПК дзіцячы сад − сярэдняя школа Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці*

# Многавугольнік

## Матэматыка. II клас

***Мэта:*** пазнаёміць з паняццем «многавугольнік», вучыць размяжоўваць віды многавугольнікаў.

***Задачы:***

- садзейнічаць удасканаленню вылічальных уменняў і навыкаў праз рашэнне лікавых выразаў, няроўнасцей;
- развіваць лагічнае мысленне праз рашэнне састаўных задач;
- садзейнічаць выхаванню навыка самаацэнкі вучэбнай дзейнасці.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Матэматыка» для II класа (Г. Л. Мураўёвай, М. А. Урбан, 2020); матэматычны трэнажор; відэа з Адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурса; карткі; лічыльныя палачкі; карта самаацэнкі; рэбус; «дрэва дасягненняў»; ілюстрацыі птушак.

### I. Арганізацыйны этап.

— Дзеці, сёння першыя дзянёчкі вясны. Але паглядзіце за акно, дрэвы пакуль без свайго адзення. Давайце паспрабуем паклікаць да нас у клас вясну і апрануць наша дрэва, якое вы бачыце на дошцы. Чаго яму не хапае?

— У кожнага з вас ёсць лісточкі рознага колеру. Я папрашу вас узяць адзін з іх (любога колеру) і дапамагчы дрэву апрануцца ў рознакаляровую лістоту.

— Дзеці, хто выбраў:

- зялёны ліст, — таго чакае поспех на сённяшнім уроку;
- жоўты ліст, — будуць актыўныя і старанныя;
- чырвоны ліст, — будуць ісці да сваёй мэты, не зважаючы на цяжкасці.

— Памятайце, што прыгажосць дрэва залежыць толькі ад вас!

— Дзеці, а каго не хапае на нашым дрэве? Сёння да нашага дрэва прыляцяць птушкі, але вы павінны працаваць старанна, выконваць заданні правільна.

**II. Праверка дамашняга задання.**

— Каб веды былі трывалыя, патрэбна заўсёды выконваць дамашняе заданне. Давайце праверым яго (№ 1, 2, с. 53)

Франтальная праверка ў вуснай форме.

— Ацаніце выкананне дамашняга задання на карце самаацэнкі.



✓ Заданне выканана правільна.

✓ Дапусціў адну памылку пры выкананні задання.

✓ Заданне выканана няправільна.

**III. Вуснае лічэнне.**

— Адгадайце загадку:

Ён тут добра паабедаў,
З'еў катлету з караедаў,
І на дрэва сеў яшчэ раз —
Дзёўбае, каб паабедаць. *(Дзяцел.)* [1]

- Матэматычны трэнажор «Футбол» (адпрацоўка вуснага вылічэння у межах 100) (*гл. прэзентацыю да артыкула*).
- Заданне на картках: назваць і падлічыць колькасць фігур.



2 3 2 3 2 1

— Ацаніце сваю работу на картцы самаацэнкі. І вучань, які не дапусціў памылак, можа пасадзіць дзятла на дрэва.

**IV. Паведамленне тэмы ўрока.**

— Тэму нашага ўрока вы даведаецеся, калі разгадаеце рэбус.

**6, 7**




**V. Вывучэнне новай тэмы.**

- Прагляд відэа з Адзінага адукацыйна-інфармацыйнага рэсурсу па тэме «Многавугольнік» (https://eior.by/upload/info-oso/math/2class/MAP02_0349.mp4).
- Праца з **лічыльнымі палачкамі**, выкладванне фігур.
- Праца з падручнікам.

Падручнік № 1, с. 54.

— Назавіце фігуры, якія вы бачыце на малюнку. Колькі ў яе вуглоў і старон?

— Паўторым правіла:

**У многавугольніка старон столькі ж, колькі і вуглоў.**

— Ці ўсе зразумелі, што такое многавугольнік? Можам мы засяліць

наступную птушку на наша дрэва?

Адгадайце загадку:

Чорная шапачка

І палоска шалічка,

Жоўтая спаднічка,

А завуць яе … (*сінічка*). [ 1 ]

Вучань засяляе сінічку на дрэва. Ацэньваем гэты этап на карце самаацэнкі.

***Музычная фізкультхвілінка.***

**VI. Замацаванне вывучанага.**

1) № 2, с. 55 (пісьм.) — рашэнне прыкладаў;

2) № 3, с. 55 (пісьм.) — рашэнне прыкладаў і выкананне праверкі;

3) № 4, с. 55 (пісьм.) — рашэнне няроўнасцей.

— Колькі ў 1 дм сантыметраў?

— А колькі сантыметраў у 2 дм; 10 дм?

4) № 5, с. 56 (пісьм.)

1 г. — 20 т.

**2** г. — ?, на 6 т. больш

3 г. — ?, на 3 т. менш

— Што значыць лік 20; 6; 3?

— Прачытайце пытанне задачы?

— Ці можам адразу адказаць на пытанне задачы? Чаму?

— Ці можам знайсці, колькі тартоў упрыгожылі за другую гадзіну?

— Якім дзеяннем?

— Ці можам знайсці, колькі тартоў упрыгожылі за трэцюю гадзіну?

— Якім дзеяннем?

— Запішыце рашэнне задачы з паясненнем.

— Этап замацавання пройдзены. Адгадайце, каго мы можам пасяліць яшчэ на наша дрэва.

У шэрай шубцы пер'явой,

І ў марозы ён герой.

Назаві яго хутчэй!

Хто там скача? *(Верабей.)* [1]

**VII. Этап кантролю і самакантролю.**

— Як называецца многавугольнік, у якога 5 вуглоў? Колькі ў яго старон?



**<u>Карткі</u>**

1. Назаві фігуры. Закончы рад. Якой фігуры не хапае?

— Я вельмі рада, што і гэты этап вы паспяхова пераадолелі. Адгадайце, хто ж на гэты раз паляціць на наша дрэва:

Выпаў снег, мятуць мяцелі,

Да нас госці прыляцелі.

На рабіну паглядзі —

Там паселі … (*снегіры*). [1]

**VIII. Этап інфармавання аб дамашнім заданні.**

№ 1, 2, с. 55.

Чытанне задачы.

Метро — гэта падземная гарадская чыгунка. У Мінску, нашай сталіцы, таксама ёсць метро.

— Колькі станцый на першай лініі метро? *(15.)*

— На другой? *(На 3 больш, чым на 1-й.)*

— На трэцяй? *(На 4 больш, чым на 2-й.)*

— Якое пытанне задачы? Ці можам адразу на яго адказаць?

**IX. Рэфлексія.**

— Сёння вы старанна працавалі на ўроку, наша дрэва за ўрок напоўнілася жыццём. Адзначце, які настрой у вас пасля урока:

- калі вы задаволены сваёй працай, то вазьміце зялёны лісточак і ўпрыгожце дрэва;
- калі ў вас не ўсё атрымалася выканаць правільна, але ўрок прайшоў з карысцю, то выбірайце жоўты лісточак;
- калі вы не задаволены сваёй працай і ніякай карысці ад урока няма, то выбірайце чырвоны лісточак.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Мова нанова: птушкі [Электронны рэсурс] / Л. А. Федюк. — Рэжым доступу: https://ddu91grodno.schools.by/m/class/45778/news/770927. — Дата доступу: 18.07.2023.

2. Сборник заданий «Геометрические фигуры» как средство развития регулятивных универсальных учебных действий у обучающихся 2 класса на уроках математики [Электронны рэсурс] / О. Л. Павлова. — Рэжым доступу: https://урок.рф/library/sbornik_zadanij_geometricheskie_figuri_kak_sredst_094200.html. — Дата доступу: 18.07.2023.